**<u>Рэкамендацыі па арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў міжкурсавы перыяд у 2026/2027 навучальным годзе</u>**

Мэта метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў перыяд паміж павышэннямі кваліфікацыі (далей – міжкурсавы перыяд) – павышэнне прафесійнага майстэрства настаўнікаў; вывучэнне, абагульненне і распаўсюджванне эфектыўнага педагагічнага вопыту.

Каардынацыя метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў міжкурсавы перыяд ажыццяўляецца на:

*рэспубліканскім узроўні* – дзяржаўнай установай адукацыі «Акадэмія нацыянальнай адукацыі» (далей – АНА);

*абласным узроўні* – інстытутамі развіцця адукацыі (далей – ІРА);

*раённым узроўні* – раённымі (гарадскімі) вучэбна-метадычнымі кабінетамі (далей– Р(Г)ВМК).

Пры арганізацыі метадычнай работы выкарыстоўваецца *каскадны прынцып*, які дае магчымасць ахапіць настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры мерапрыемствамі метадычнага характару на рэспубліканскім, абласным, раённым узроўнях, установы агульнай сярэдняй адукацыі.

**Мэтавыя групы для арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў міжкурсавы перыяд:**

*АНА* – метадысты ІРА, спецыялісты РВМК, якія курыруюць навучанне па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»; старшыні раённых і школьных вучэбна-метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры; настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, якія працуюць з высокаматываванымі навучэнцамі; удзельнікі рэспубліканскай творчай групы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры;

*ІРА* – спецыялісты РВМК, якія курыруюць навучанне па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»; намеснікі кіраўнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі; старшыні раённых і школьных вучэбна-метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры; удзельнікі абласной творчай групы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, у тым ліку маладыя настаўнікі са стажам да 5 гадоў;

*Р*(Г)*ВМК* – намеснікі кіраўнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, старшыні раённых (гарадскіх) і школьных вучэбна-метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры; настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, у тым ліку маладыя настаўнікі са стажам да 5 гадоў.

Міжкурсавая работа з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2026/2027 навучальным годзе арганізуецца на ўсіх названых вышэй узроўнях па адзінай тэматыцы, якая вызначана з улікам вынікаў ЦЭ, рэспубліканскай кантрольнай работы (РКР), НІКА-2026, вынікаў вывучэння адукацыйных запытаў педагагічных работнікаў.

У 2026/2027 годзе асноўнымі тэмамі міжкурсавай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры з'яўляюцца:

эфектыўныя метады, прыёмы, сродкі вывучэння найбольш складаных тэм адукацыйных праграм па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;

арганізацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў працэсе навучання па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;

фарміраванне функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;

работа з высокаматываванымі вучнямі ў працэсе навучання вучэбным прадметам «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;

фарміраванне ў вучняў уменняў вучыцца сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;

фарміраванне матывацыі вучняў да вывучэння вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура».

**Заўвага**. На абласным і раённым узроўнях могуць быць вызначаны дадатковыя тэмы для арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры з улікам іх прафесійных цяжкасцей і адукацыйных патрэб.

## Этапы арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2026/2027 навучальным годзе ў міжкурсавы перыяд

### ***Этап 1. Планаванне і арганізацыя метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў міжкурсавы перыяд (да 01.09.2026)***

| Змест дзейнасці | Адказныя | Вынік |
|---|---|---|
| Аналіз вынікаў ЦЭ, РКР-2026, НІКА-2026, вынікаў кантролю, маніторынгаў, анкетавання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры на ***рэспубліканскім, абласным, раённым узроўнях;*** выяўленне тэм, пытанняў, якія выклікаюць прафесійныя цяжкасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры | АНА,<br>ІРА<br>Р(Г)ВМК | Рэспубліканскі каардынацыйны план мерапрыемстваў дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў на 2026/2027 навучальны год (раздзел «Навучальныя прадметы "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"») |
| Вызначэнне тэм міжкурсавай метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры, актуальных ***для рэспублікі, вобласці, раёна*** | АНА,<br>ІРА,<br>Р(Г)ВМК | |
| Правядзенне ўстановачных семінараў па пытаннях арганізацыі міжкурсавай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2026/2027 навучальным годзе | АНА,<br>ІРА,<br>Р(Г)ВМК | Размяшчэнне рэкамендацый па арганізацыі метадычнай работы з настаўнікамі |

| | | |
|---|---|---|
| | | беларускай мовы і літаратуры на сайце АНА. Зацвярджэнне плана міжкурсавой метадычнай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры на ***ўзроўні вобласці, раёна*** |

***Этап 2. Практычны (з 1 верасня 2026 г. па 25 мая 2027 г.)***

| **Змест дзейнасці** | **Адказныя** | **Вынік** |
|---|---|---|
| 1.Работа з рэспубліканскай (абласнымі) творчымі групамі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры:<br>распрацоўка метадычных матэрыялаў па тэмах:<br>эфектыўныя метады, прыёмы, сродкі вывучэння найбольш складаных тэм навучальных праграм па вучэбных прадметах «Беларусская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>арганізацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў працэсе навучання вучэбным прадметам «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>работа з высокаматываванымі вучнямі ў працэсе навучання вучэбным прадметам «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне ў вучняў уменняў вучыцца сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне матывацыі вучняў да вывучэння вучэбных | АНА<br>ІРА | Стварэнне і размяшчэнне на сайце АНА:<br>1)банка заданняў для правядзення кантрольных, тэматычных самастойных работ, практычных работ па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>2)“метадычнай скарбонкі” па вывучэнні найбольш складаных тэм вучэбнай праграмы, па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці вучняў, рабоце з высокаматываванымі вучнямі ў працэсе навучання па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» |

| | | |
|---|---|---|
| прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» | | |
| 2. Правядзенне семінараў-практыкумаў у вочнай і дыстанцыйнай формах для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры па тэмах:<br>эфектыўныя метады, прыёмы, сродкі вывучэння найбольш складаных тэм навучальных праграм па вучэбных прадметах «Беларусская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>арганізацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў працэсе навучання вучэбным прадметам «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>работа з высокаматываванымі вучнямі ў працэсе навучання вучэбным прадметам «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне ў вучняў уменняў вучыцца сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне матывацыі вучняў да вывучэння вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» | спецыялісты АНА, ІРА; настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, члены рэспубліканскай і абласных творчых груп; аўтары навучальных дапаможнікаў па беларускай мове і літаратуры | Матэрыялы навучальных семінараў размяшчаюцца на сайтах АНА, ІРА |
| 3. Работа «Рэспубліканскай метадычнай школы: урок ХХІ стагоддзя»: правядзенне і аналіз адкрытых урокаў, майстар-класаў (з удзелам членаў рэспубліканскай, абласных творчых груп настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры):<br>*4 заняткі ў навучальным годзе ў кожнай вобласці па складаных* | ІРА, Р(Г)ВМК | Тэматычная ўкладка «Рэспубліканская метадычная школа: урок ХХІ стагоддзя» на сайтах ІРА, у якой размяшчаюцца матэрыялы адкрытых урокаў і майстар-класаў |

| | | |
|---|---|---|
| *тэмах вучэбнай праграмы па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»* | | |
| 4. Выяўленне і абагульненне эфектыўнага вопыту работы па тэмах:<br>эфектыўныя метады, прыёмы, сродкі вывучэння найбольш складаных тэм навучальных праграм па вучэбных прадметах «Беларусская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>арганізацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў працэсе навучання вучэбным прадметам «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>работа з высокаматываванымі вучнямі ў працэсе навучання вучэбным прадметам «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне ў вучняў уменняў вучыцца сродкамі вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура»;<br>фарміраванне матывацыі вучняў да вывучэння вучэбных прадметаў «Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» | ІРА, Р(Г)ВМК | Размяшчэнне матэрыялаў абагульненага вопыту педагагічнай дзейнасці на сайтах ІРА |
| 5. Рэспубліканскі калядны фестываль педагагічнага майстэрства | АНА | 5. Размяшчэнне матэрыялаў эфектыўнага досведу працы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры на сайтах АНА, ІРА |
| 6. Арганізацыя вочна-дыстанцыйнай школы для настаўнікаў беларускай мовы і | АНА | |

| | | |
|---|---|---|
| літаратуры па рабоце з адоранымі навучэнцамі | | |
| 6.1. Абагульненне эфектыўнага досведу работы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры з адоранымі навучэнцамі | ІРА, Р(Г)УМК | Размяшчэнне матэрыялаў эфектыўнага досведу работы настаўнікаў беларускай мовы на сайтах ІРА |
| 6.2. Прыцягненне эфектыўна працуючых настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры да правядзення тэматычных змен у НДЦ "Зубраня" | АНА, ІРА | Правядзенне тэматычных змен у НДЦ "Зубраня" |

***Этап 3. Рэфлексіўна-ацэначны (з 25 мая па 1 ліпеня 2027 г.)***

| Змест дзейнасці | Адказныя | Вынік |
|---|---|---|
| 1. Аналіз вынікаў міжкурсавай работы з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ў 2026/2027 навучальным годзе<br>2. Дыягностыка прафесійных цяжкасцяў і адукацыйных запытаў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры | АНА, ІРА, Р(Г)ВМК | Аналітычная інфармацыя як аснова для планавання міжкурсавай работы ў 2027/2028 навучальным годзе |

**Дадатак 1.**

**1. Тыповыя памылкі вучняў па выніках РЦЭ-2026 па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

Прааналізаваўшы рэзультаты экзаменацыйнай работы, прапанаванай на рэпетыцыйным цэнтралізаваным экзамене (далей – РЦЭ) па беларускай мове ў 2026 годзе, зробім акцэнт на заданнях, якія мелі найменшы працэнт выканання.

*Маўленне. Тэкст. Стылістыка.*

Функцыянальныя стылі маўлення.

*Фанетыка і арфаэпія. Арфаграфія.*

Зычныя гукі. Зычныя цвёрдыя, мяккія; глухія, звонкія; свісцячыя і шыпячыя. Іх вымаўленне і правапіс.

*Лексіка. Фразеалогія.*

Слова, яго лексічнае значэнне.

*Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія.*

Марфемы як структурна-значымыя часткі слова.

*Марфалогія і арфаграфія.*

Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс.

Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў.

Правапіс ***не*** з рознымі часцінамі мовы.

Скланенне і правапіс колькасных лічэбнікаў.

Трыванні дзеяслова. Лады дзеяслова. Дзеясловы абвеснага, умоўнага і загаднага ладу, іх утварэнне і правапіс.

Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і правапіс.

Часціца як службовая часціна мовы.

*Сінтаксіс і пунктуацыя.*

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай).

Аднасастаўныя сказы, іх будова.

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі.

Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах.

Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах.

Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі.

Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.

На падставе аналізу статыстычных даных аб выніках выканання заданняў РЦЭ па беларускай мове ў 2026 годзе, аналізу выяўленых тыповых цяжкасцей і памылак вучняў прапануецца шэраг агульных рэкамендацый па ўдасканаленню арганізацыі і методыкі выкладання вучэбнага прадмета «Беларуская мова».

Настаўнікам мэтазгодна арганізоўваць спецыяльную работу ў прадметным навучанні, накіраваную на фарміраванне ў навучэнцаў сістэмных ведаў па беларускай мове, на выпрацоўку важнейшых прадметных уменняў і навыкаў, уменняў свядома выкарыстоўваць маўленчыя сродкі ў адпаведнасці з задачай камунікацыі; навыкаў валодання пісьмовай прамовай і інш. Пры гэтым асаблівую ўвагу неабходна надаць выкарыстанню метадычных падыходаў, звязаных з выкананнем РЦЭ, ЦЭ, ЦТ.

Арганізаваць мэтанакіраваную сістэмную адукацыйную дзейнасць, арыентаваную на фарміраванне ў вучняў пазнавальных універсальных навучальных дзеянняў, якія ў спалучэнні з прадметнымі ведамі і ўменнямі, непасрэдна ўключаюцца ў разумовую дзейнасць па пошуку правільнага адказу на тое ці іншае заданне.

Рэкамендуем выкарыстоўваць у практыцы выкладання беларускай мовы актыўныя метады навучання, сучасныя педагагічныя тэхналогіі, якія актывізуюць пазнавальную дзейнасць навучэнцаў.

Мэтазгодна стварыць электронны банк навучальных матэрыялаў, які ўключае дыферэнцыраваныя заданні, тэсты, навучальныя модулі і іншыя рэсурсы, якія настаўнікі могуць выкарыстоўваць для работы з рознымі групамі навучэнцаў.

На ўзроўні раённых (гарадскіх) вучэбна-метадычных кабінетаў (цэнтраў) у міжкурсавы перыяд рэкамендуецца правесці мерапрыемствы, накіраваныя на

удасканаленне кампетэнцый настаўнікаў па падрыхтоўцы дзейнасці вучняў к ЦЭ і ЦТ у рамках дзейнасці вучэбна-метадычных аб'яднанняў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры:

1) навучальныя семінары, трэнінгі па асобных тэмах навучальных праграм, па якіх навучэнцы адчуваюць найбольшыя цяжкасці па выніках ЦЭ;

2) тэматычны семінар "Аналіз тыповых памылак, дапушчаных навучэнцамі пры выкананні ЦЭ па беларускай мове ў 2026 годзе";

3) тэматычны семінар "Падрыхтоўка да ЦЭ: ад паўтарэння тэорыі да рашэння тэставых заданняў";

4) навучальны семінар-практыкум "Метадычны і тэхналагічны складнік падрыхтоўкі навучэнцаў да ЦЭ па вучэбным прадмеце "Беларуская мова".

У рамках пасяджэнняў вучэбна-метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры рэкамендуецца абмеркаваць наступныя пытанні:

асаблівасці падбору метадычнага інструментарыя для ўрока беларускай мовы па арганізацыі падрыхтоўкі навучэнцаў да ЦЭ; этапы работы па падрыхтоўцы да ЦЭ;

змястоўна-тэхналагічная характарыстыка факультатыўных заняткаў па падрыхтоўцы вучняў да ЦЭ па беларускай мове;

асаблівасці пабудовы ўрока беларускай мовы ў XI класе: адбор навучальнага зместу, арганізацыя індывідуальнай і калектыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў як паказчык падрыхтоўкі навучэнцаў да ЦЭ;

роля лічбавых адукацыйных рэсурсаў у падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦЭ;

навучальныя і кантрольныя тэставыя работы: этапы распрацоўкі тэстаў розных тыпаў (планаванне, змест заданняў, выбар формы тэставых заданняў, складанне ключа); спецыфікацыя і структура тэста на ЦЭ па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»; аналіз тэм, якія выклікалі асаблівыя цяжкасці пры выкананні заданняў ЦЭ па беларускай мове.

**Дадатак 2.**

## Прыкладная тэматыка і змест пасяджэнняў вучэбна-метадычнага аб'яднання настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры на абласным, раённым (гарадскім) узроўнях, ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі

### Пасяджэнне № 1

**Тэма «Арганізацыя кантрольна-ацэначнай дзейнасці ў працэсе навучання вучэбным прадметам "Беларуская мова" і "Беларусская літаратура"»**

*Форма правядзення:* семінар-практыкум

*Мэта пасяджэння:* удасканаленне прафесійных кампетэнцый настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ў галіне арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці як сродку кіравання якасцю лінгвістычнай адукацыі.

*Задачы:*

актуалізаваць тэарэтычныя асновы кантрольна-ацэначнай дзейнасці;

разгледзець сучасныя формы і метады ацэньвання навучальных дасягненняў вучняў па беларускай мове і літаратуры;

прааналізаваць асаблівасці арганізацыі рэфлексіўнай дзейнасці на навучальным занятку;

вызначыць эфектыўныя спосабы фарміравання навыкаў самаацэнкі і ўзаемаацэнкі ў вучняў;

абмеркаваць выкарыстанне лічбавых інструментаў для аўтаматызацыі кантролю і маніторынгу адукацыйных вынікаў.

*Навукова-метадычны блок.*

Ацэнка і адзнака ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі. Крытэрыі і паказчыкі ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў. Асноўныя віды кантролю вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў і тэхналогія іх ацэньвання. Лабараторна-практычны кантроль і тэхналогія яго ацэньвання. Тэматычны кантроль вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў як абавязковы від кантролю.

Метадычныя асаблівасці складання творчых, даследчых, пошукавых, сітуацыйных заданняў, задач і пытанняў.

*Практычны блок.*

Распрацоўка рэкамендацый па арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці для ўрокаў беларускай мовы і літаратуры з улікам крытэрыяў і паказчыкаў вуснага адказу і ацэнкі ступені сфарміраванасці правапісных уменняў і навыкаў вучняў.

**Пасяджэнне № 2**

**Тэма «Сучасныя навучальныя заняткі па беларускай мове і літаратуры ў кантэксце фарміравання функцыянальнай адукаванасці як умова павышэння якасці адукацыі»**

*Форма правядзення:* семінар-практыкум

*Мэта пасяджэння:* удасканаленне прафесійных кампетэнцый настаўнікаў па выкарыстанні на вучэбных занятках па беларускай мове і літаратуры эфектыўных метадаў і прыёмаў, накіраваных на фарміраванне функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў.

*Задачы:*

актуалізаваць веды настаўнікаў аб сучасных падыходах і структуры функцыянальнай адукаванасці (у прыватнасці, чытацкай і камунікатыўнай);

праналізаваць перавагі метадаў і прыёмаў навучання, якія садзейнічаюць фарміраванню функцыянальнай адукаванасці вучняў.

*Навукова-метадычны блок.*

Вучэбнае праектаванне як форма самастойнай работы навучэнцаў.

Чытацкая адукаванасць як складнік функцыянальнай адукаванасці.

Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу на ўроках беларускай мовы і літаратуры. Работа з тэкстамі розных відаў і розных жанраў як абавязковы этап сучаснага занятку беларускай мовы і літаратуры, які садзейнічае фарміраванню функцыянальнай адукаванасці вучняў, перш за ўсё чытацкай. Выкарыстанне на вучэбных занятках метадаў, прыёмаў навучання, якія садзейнічаюць фарміраванню функцыянальнай адкукаванасці вучняў: прыёмы камунікатыўнага

метаду: публічнае выступленне, вусная прэзентацыя, дыскусія, дэбаты і інш. Прыёмы эўрыстычнага метаду: мазгавы штурм, функцыянальны аналіз, знаходжанне аналогій. вылучэнне гіпотэзы, яе доказ; пастаноўка праблемы і стварэнне праблемнай сітуацыі з наступным аналізам і інш. Выкарыстанне практыка-арыентаваных заданняў міжпрадметнага зместу.

*Практычны блок.*

Мадэляванне этапаў сучаснага ўрока з выкарыстаннем метадаў і прыёмаў, якія садзейнічаюць фарміраванню функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў

## Пасяджэнне № 3

**Тэма «Цэнтралізаваны экзамен (ЦЭ) па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі як паказчык сфарміраванасці прадметных кампетэнцый навучэнцаў»**

*Форма правядзення:* семінар-практыкум

*Мэта пасяджэння:* удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці настаўнікаў і павышэнне эфектыўнасці падрыхтоўкі навучэнцаў да ЦЭ па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» па завяршэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

*Задачы:*

прааналізаваць вынікі ЦЭ мінулых гадоў, выявіўшы тыповыя памылкі навучэнцаў пры выкананні заданняў розных узроўняў складанасці;

сістэматызаваць эфектыўныя педагагічныя тэхналогіі і прыёмы, накіраваныя на ўстараненне тыповых памылак пры выкананні тэставых заданняў па беларускай мове;

абагульніць вопыт арганізацыі індывідуальнай і калектыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў 10-11 класаў пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі па беларускай мове;

распрацаваць практычны блок з разборам тыповых памылак па канкрэтных раздзелах вучэбнага прадмета «Беларуская мова» (арфаграфія, марфалогія, словаўтварэнне, сінтаксіс, пунктуацыя).

*Навукова-метадычны блок.*

Механізм правядзення выпускных экзаменаў ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі адукацыі. Выпускны экзамен у форме цэнтралізаванага тэсціравання па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»: нарматыўнае правае забеспячэнне, атэстацыя навучэнцаў. Прадметныя вынікі асваення адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі па беларускай мове як паказчык падрыхтаванасці вучняў да цэнтралізаванага экзамену. Аасаблівасці ўрока беларускай мовы ў XI класе: адбор навучальнага зместу, арганізацыя індывідуальнай і калектыўнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў. Віды тэставых работ і этапы распрацоўкі тэстаў розных тыпаў: планаванне, распрацоўка заданняў, складанне ключа; метадычныя рэкамендацыі па складанні і ацэньванні тэставых работ па вучэбным прадмеце "Беларуская мова" (http://www.adu.by).

*Практычны блок.*

Аналіз матэрыялаў адкрытага банка тэставых матэрыялаў па вучэбных прадметах («Беларуская мова» Рэспубліканскі Інстытут Кантролю Ведаў (rikc.by)).

**Пасяджэнне № 4**

*Тэма:* **«Навучальная матывацыя як адзін з вядучых фактараў паспяховасці навучання»**

*Форма правядзення:* семінар-практыкум

*Мэта пасяджэння:* удасканаленне прафесійных кампетэнцый настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры ў галіне развіцця вучэбнай матывацыі навучэнцаў як аднаго з вядучых фактараў паспяховасці навучання.

*Задачы:*

сістэматызаваць веды настаўнікаў аб псіхалагічнай сутнасці вучэбнай матывацыі, яе структуры і відах (унутраная і знешняя);

прааналізаваць уплыў матывацыйнага этапа ўрока на выніковую рэзультатыўнасць і якасць засваення вучэбнага матэрыялу;

вывучыць і ўкараніць у практыку эфектыўныя педагагічныя метады і прыёмы, здольныя выклікаць эмацыйны водгук у вучняў (праблемныя сітуацыі, гульнявыя элементы, практычная значнасць ведаў і інш.);

распрацаваць алгарытм уключэння элементаў інтэрактыўнага і праектнага навучання ў паўсядзённую практыку для развіцця навучальнай матывацыі навучэнцаў.

*Навукова-метадычны блок.*

абагульненне і сістэматызацыя тэарэтычных палажэнняў аб ключавых паняццях;

"матывацыя вучэння"; – стымуляванне імкненняў педагогаў да сістэматызацыі, паглыблення ведаў па псіхалогіі матывацыі;

унутраная і знешняя матывацыі як супрацьлеглыя бакі адзінай з'явы, якія звязваюць вучобу і яе мэту;

псіхолага-педагагічныя аспекты матывацыі вучэбнай дзейнасці;

павышэнне матывацыі вучняў да вывучэння беларускай мовы і літаратуры шляхам інтэграцыі праектнай і даследчай дзейнасці ў мэтах фарміравання камунікатыўнай кампетэнтнасці;

арганізацыя індывідуальнай работы па павышэнні ўзроўню вучэбнай матывацыі ў вучняў, якія адчуваюць цяжкасці ў засваенні адукацыйнай праграмы па беларускай мове;

актывізацыя ведаў і дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры праз прымяненне гульнявых тэхналогій;

самаацэнка як усведамленне навучэнцамі ўсіх кампанентаў вучэбнай дзейнасці;

актывізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў з дапамогай ажыццяўлення ў ходзе навучальнага працэсу міжпрадметных сувязей;

пошук і ўвядзенне ў практыку навучання беларускай мове і літаратуры эфектыўных форм праверкі і ацэнкі ведаў.

удасканаленне ўзроўню педагагічнага майстэрства настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, іх эрудыцыі і кампетэнтнасці ў прадметнай галіне і методыкі яе выкладання.

*Практычны блок.*

Распрацоўка метадычных рэкамендацый для настаўнікаў "Шляхі развіцця вучэбнай матывацыі".